***А.І. Дамаронак***
БДЭУ (Мінск)

# РОЛЯ ФРАНЦІШАКА БАГУШЭВИЧА Ў АДРАДЖЭНЧЭСКІМ РУХУ БЕЛАРУСІ КАНЦА ХІХ ст.

Францішак Багушэвіч нарадзіўся ў фальварку Свіраны, каля Вільні (сучасная Літва) у сям'і выхадцаў з дробнай шляхты Казіміра і Канстанцыі (у дзявоцтве – Галаўня) Багушэвічаў. Дзіцячыя гады пісьменніка прайшлі ў асяроддзі блізкім да сялянскага. Пачатковую адукацыю Ф. Багушэвіч атрымаў у Віленскай гімназіі, якую скончыў 26 ліпеня 1861 года. Пасябраваўся з Цітусам Далеўскім, Юллянам Чарноўскім, Вінцэнтам Віткоўскім, Канстанты Далеўскім, Зыгмунтам Мінейка, якія сталі пазней актыўнымі ўдзельнікамі паўстання 1863-1864 г і аказалі ўплыў на станаўленне светапогляду Багушэвіча. Яшчэ гімназістам Ф. Багушэвіч не застаўся абыякавым да гісторыі і культуры края, усталяваў сувязі з музеем старажытнасцей у Вільні створаным Адамам Киркорам, перадаўшы туды ў 1865 г. некалькі прадметаў краязнаўча-археалагічнага характару. У тым жа годзе паступіў у Пецярбургскі ўніверсітэт на фізіка-матэматычны факультэт, аднак праз 2 месяцы быў выключаны за ўдзел у студэнцкіх хваляваннях. Актыўны ўдзельнік паўстання 1863—1864,Франтішак, быў паранены пад час баю ў Аўгустоўскіх лясах. Яго бацька, сястра і брат Апалінар таксама дапамагалі рэвалюцыянерам. Першае вядомае публічнае выступленне Багушэвіча как літаратара адбылося 4 красавіка 1885 г. на старонках польскага часопіса «Край» («Kraj»), што выдаваўся ў Пецярбургу. Віленскі карэспандэнт пісаў пра эканамічны крызіс, гаспадарчае жыццё і судовую практыку ў Паўночна-Заходніх губернях. За сем гадоў (1885-1891) «Край» змясціў звыш паўсотні артыкулаў і нататкаў, якія дасылаў Францішак Багушэвіч, падпісваючы іх рознымі псеўданімамі: Huszicz (утворана ад скарачэння прозвішча), Ten, Tamten, Demos і інш. Яго віленскія допісы саркастычныя і балюча-праўдзівыя, статыстычна-інфармацыйныя і ярка публіцыстычныя. Увосень 1891 г. у Кракаве выходзіць першы зборнік паэта «Дудка беларуская» пад псеўданімам *Мацей Бурачок*. Пры жыцці паэта пад

псеўданімамі былі надрукаваны вершаваны зборнік «Смык беларускі» (Познань, 1894) і апавяданне «Тралялёначка» (Кракаў, 1892). Выступаючы ад імя ўсяго працоўнага беларускага народа, Францішак Багушэвіч быў пераважна ідэолагам сялянства. З сялянствам, а таксама з дэмакратычнай інтэлігенцыяй звязваў ён свае вызваленчыя ідэалы. Светапогляд і ідэйныя перакананні адлюстроўвалі наспелыя патрэбы нацыянальнага адраджэння і развіцця народаў, пазбаўленых сваіх суверэнных правоў на самастойнае грамадскае і духоўна-культурнае існаванне, адбудову сваёй дзяржавы. Моцным і шматгранным было ідэйна-творчае ўздзеянне Ф. Багушэвіча на паслядоўнікаў. Яго спадчыну наследавалі ў сваёй творчай дзейнасці А. Гурыновіч, Цётка, Я. Купала, Я. Колас, Я. Ціхінскі. І не выпадкова слвутага паэта называюць “бацькам беларускага адраджэння”.